

■ Нефармат

# ТВАРЭЦ СВАЙГО НАСТРОЮ

Мой сын-студэнт купіў куртку: дарагую, кароткую, не надта цёплую. Гэта ў яго зімовая называецца. Скарыстаўся маёй трохтыднёвай адсутнасцю. Калі, вярнуўшыся дадому, стала, мякка кажучы, ушчуваць за неабачлівасць, ён адказаў: «Зімы ж усё роўна не будзе». І цяпер мне ледзь не штодня нагадвае пра тую размову.

А зіма ў нас, у Брэсце, і праўда, была хіба толькі тры дні. Увесь астатні час — дажджы, цемра і слата. Студэнцкія туманы сталі амаль звыклай з'явай. Вось і сёння ранкам у аўтобусе жанчыны, што ехалі на працу, наракалі на адсутнасць настрою. Маўляў, што гэта за жыццё? Плацяць мала, пенсійны ўзрост паднялі, нават сонца тыднямі, а то і месяцамі не ўбачыш, адкуль чэрпаць пазітыў? І падумалася тады, што людзі немаладога веку, з якімі даводзілася сустракацца апошнім часам, як правіла, бывалі ў добрым настроі, выглядалі аптымістамі. У іх бы павучыцца.

Марыя Іванаўна сустрэла сваё васьмідзесяцігоддзе ў бальнічнай палаце. І з гэтай нагоды ніколькі не засмуцілася. Наадварот, яна адна сярод шасці суседак па палаце, якіх прывезлі «па хуткай», праходзіла планавае лячэнне. І хоць тavaрышкі былі куды маладзейшыя, але з хворымі спінамі і непаслухмянымі нагамі не маглі ўзлезці на крэсла, каб адчыніць фортку і праветрыць пакой. Яна ж, на зайздрасць ім, гэта рабіла лёгка. Ахвотна дапамагала іншым у нейкіх дробязях, заўсёды жартавала. Гледзячы вось так, збоку, можна было падумаць, што жанчына пражыла шчаслівае бестурботнае жыццё. Але гэта далёка не так. Проста яна ў любой, нават самай цяжкай, сітуацыі не апускала рукі і разлічвала толькі на сябе. Недзе ў 35-гадовым узросце засталася адна з двума сынамі. Не, муж не памёр, ён сышоў да другой.

Так і круцілася сама. Пасля змены на заводзе паспявала ўпраўляцца дома. Хлопцы выраслі, ажаніліся, дачакалася ўнукаў, выйшла на пенсію. Тут новае выпрабаванне — цяжка захварэў старэйшы. Пасля аперацыі ў Мінску доўга выходжвалі яго разам з нявесткай. Цяпер вось адчувае сябе значна лепш, нават у бальніцы яе праведваў. Ці ж не радасць для маці?

Дзеці выраслі добрымі людзьмі, гэтым яна шчаслівая. І калі іхні блудны бацька вярнуўся праз шмат гадоў ад сваёй маладой з адным чамаданам, яна, Марыя, на парог не пусціла. А старэйшы сын купіў дом у прыгараднай вёсцы, аформіў як сваю дачу і пасяліў там бацьку. Пенсіянер успомніў сваё вясковае мінулае, развёў падсобную гаспадарку. А яна рэгулярна ездзіць туды, дапамагае амаль 30 сотак агарода. «Усё ж для сваіх дзяцей, — разважае, — бо з таго ўчастка іх сем'і забяспечаны бульбай, агароднінай, садавінай». Ну а дзед для ўнукаў гадуе кабанчыка, на канікулах частуе казіным малаком. Не раз і не два прасіў яе былы муж сысціся і жыць адной сям'ёй. Але Марыя Іванаўна застаецца непахіснай: «Калі ты мяне з дзецьмі пакінуў, і я адна справілася, дык і цяпер ты мне не патрэбны. І кропка».

Летам яна шчыруе на агародзе, зімой стараецца падправіць здароўе. Сустракаецца з сяброўкамі, любіць глядзець серыялы пра міліцыю. Выпісвалася Марыя Іванаўна ў пятніцу. Сказала, што ў суботу зранку нагатуе ўсяго, вечарам прыйдуць дзеці з сем'ямі, пакліча суседак-сяброўак, разам адзначаць яе 80-годдзе. З самага ранку ў чаканні бальнічнай выпіскі яна была ў прыўзнятым настроі, па тэлефоне абмяркоўвала з нявесткай меню для свайго святочнага абеду і выглядала шчаслівай.

...Яшчэ адзін 80-гадовы чалавек мяне па-добраму здзівіў прыкладна год таму. Калі папярэдняя гераіня жыве ў шматкватэрным доме ў адным горадзе з дзецьмі ды ўнукамі, то Міхаіл Юстынавіч застаўся адзіным насельнікам сваёй паміраючай вёскі. Пайшла ў лепшы свет жонка, з жывых істот побач — кот і сабака. Да бліжняга населенага пункта кіламетраў пяць. Для іншага, мусіць, гэтага хапіла б, каб упасці ў дэпрэсію. А ён, былы перадавы трактарыст, ардэнаносец, штодня перазвоньваецца з таварышам па працы ранейшых гадоў, таксама ўдаўцом. «Ён крыху маладзейшы, дык я з яго пасмейваюся, — расказвае вясёлы пенсіянер, — пытаю, ці не ажаніўся, а тады папярэджваю: «Калі хочаш памерці раней часу, то жаніся з маладою». Вось так пасмяёмся, павесялім адзін аднаго, дык і настрой узнімаецца». Заўважце, для настрою адзінокі чалавек не купляе ў аўтакраме, якая дзеля яго аднаго прыходзіць, пляшку. Купляе пячэнне, фрукты. А яшчэ чакае вясну, каб выйсці ў поле, пачуць знаёмы гул трактароў, пагаварыць з цяперашнімі механізатарамі, парадавацца за тое, што жыццё працягваецца.

У рэшце рэшт, у вялікай ступені кожны сам тварэц свайго настрою, ва ўсякім разе, здольны паклапаціцца пра тое, каб настрой ніхто не сапсаваў. Доказам таму можа быць пісьмо, пра якое мне расказала рэдактар Ляхавіцкай раённай газеты. Ліст быў складзены ў форме заявы. Заяўніца прасіла ні ў якім разе не публікаваць віншаванні, калі тыя паступяць з нагоды яе, заяўніцы, юбілею, і растлумачыла прычыну: «...бо калі хоць адно слова ў тэксце мне не падабаецца, гэта прыводзіць мяне да сапсаванага настрою». Нарэшце прайшла назначаная дата, ніхто не заказаў віншаванне капрызнай спадарыні. І ў рэдактара таксама ўзняўся настрой. А што, скажыце, было б рабіць, калі б знайшліся ахвотныя і тую віншаванку апладзіці?

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

■

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.56 | 17.50 | 8.54 |
| Віцебск — | 8.51 | 17.35 | 8.44 |
| Магілёў — | 8.47 | 17.41 | 8.54 |
| Гомель — | 8.38 | 17.43 | 9.05 |
| Гродна — | 9.11 | 18.06 | 8.55 |
| Брэст — | 9.06 | 18.12 | 9.06 |

## Месяц

*Поўня 31 студзеня. Месяц у сузор'і Дзевы.*

## Імяніны

**Пр.** *Антона, Арсенія, Макара, Марка, Мікалая, Пятра, Фёдара.* **К.** *Ігната.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

### 1 ЛЮТАГА

**У краіне**

**1863** год — створаны Часовы правінцыяльны ўрад Літвы і Беларусі, цэнтр кіраўніцтва паўстаннем 1863—1864 гадоў. Літоўскі правінцыяльны камітэт выдаў Маніфест аб паўстанні і звярнуўся да насельніцтва Літвы і Беларусі.

**1913** год — нарадзіўся Сяргей Восіпавіч Прытыцкі, дзяржаўны і палітычны дзеяч Беларусі, актыўны ўдзельнік рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, адзін з арганізатараў антыфашысцкага падполля і партызанскага руху ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Пасля вызвалення Заходняй Беларусі быў абраны дэпутатам Нацыянальнага сходу. Ад імя Паўнамочнай камісіі Нацыянальнага сходу 12 лістапада 1939 года выступіў у Вярхоўным Савеце СССР з заявай аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад СССР і ўз'яднанне яе з БССР. У Вялікую Айчынную вайну — другі сакратар ЦК ЛКСМБ, намеснік начальніка, начальнік Польскага штаба партызанскага руху. У 1949—1962 гг. — першы сакратар Гродзенскага, Баранавіцкага, Маладзечанскага, Мінскага абкамаў КПБ. З 1962 года — сакратар ЦК КПБ, старшыня партыйна-дзяржаўнага кантролю ЦК КПБ і СМ БССР, намеснік старшыні Савета Міністраў БССР. З 1968 года — старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, намеснік старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. Памёр у 1971 годзе.



**1938** год — нарадзілася (в. Копань Рэчыцкага раёна) Нэлі Іванаўна Тулупава, беларуская пісьменніца. Працавала ў выдавецтве «Мастацкая літаратура», часопісе «Вожык». Аўтар зборнікаў вершаў «Станцыя надзей», «Босая цішыня», «Сонца ў хату», кніг для дзяцей. Пісала гумарыстычныя апавяданні. На вершы Тулупавай напісаны песні «Прызнанне», «Дабрыня», «Ліст да маці», «Салаўі Хатыні». На беларускую мову перакладала творы рускіх, украінскіх і іншых аўтараў. Памерла ў 2001 годзе.

**У свеце**

**1857** год — нарадзіўся Уладзімір Бехцераў, рускі ўрач-псіхіятр, акадэмік, заснавальнік рэфлексалогіі і патапсіхалогіі. Ён з'яўляецца аўтарам многіх навуковых прац, сярод якіх вылучаецца сем тамоў «Асноў вучэння пра функцыі мозгу».

**1865** год — Аўраам Лінкальн падпісаў рэзалюцыю кангрэса аб унясенні 13-й папраўкі ў Канстытуцыю ЗША, якая адмяніла рабства. З таго часу ў ЗША гэтую дату адзначаюць як Нацыянальны дзень свабоды. Да снежня 1865 года тры чвэрці штатаў краіны адобрылі гэты дакумент. 18 снежня 1865 года 13-я папраўка уступіла ў сілу.

**1942** год — нарадзіўся Леў Лешчанка, савецкі і расійскі эстрадны спявак, педагог. Паралельна з эстраднай і канцэртнай дзейнасцю Леў Валяр'янавіч працяглы час выкладае ў музычна-педагагічным інстытуце імя Гнесіных. Многія з яго вучняў сталі вядомымі артыстамі эстрады.

## УСМІХНЕМСЯ

Любы мужчына ведае, што поўная патэльня корміць, а пустая — выхоўвае.

**— Пазнаёміўся на сайце знаёмстваў з дзяўчынай, падмануў яе, што мне 20 гадоў, што я спартсмен і не жанаты. Увесь вечар і паўночы прагаварылі ў скайпе, спадабаліся адно аднаму, і яна запрасіла мяне да сябе ў госці, назваўшы вуліцу і дом нумар 55. Узяў таксі і паехаў на іншы канец горада. Аказваецца, яна такая ж, як і я!**

**— Ідэальна сышліся характарамі?**

**— Ды не... Там 53-і дом апошні.**

Расія валодае 95 % сусветных запасаў серыялаў пра паліцэйскіх.

**— Я з табой разводжуся! Ты мне здрадзіла!**

**— Што ты крычыш? Я начавала ў маёй сяброўкі Марынкі.**

**— Хлусіш! У Марынкі начаваў я!**

Калі доктар выпісаў вам рэцэпт разборлівым почыркам, будзьце асцярожныя, магчыма, гэта не доктар.

**Як кажа наш інжынер па тэхніцы бяспекі:**

**— Не совайце пальцы куды не след. Іх не так шмат, як здаецца.**



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 390.
Нумар падпісаны ў 19.30 31 студзеня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12